**І. В. Хамутова,** *аспірант*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны*
*ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **В. А. Лабачэўская,**
*доктар мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# АБРАДНАСЦЬ ВАДОХРЫШЧА: ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЯ СПЕЦЫФІКА

Вывучэннем абраднасці Вадохрышча займаецца Т. І. Кухаронак [2], аднак яе ўвага скіравана на вылучэнне лакальных асаблівасцей святкаванняў Цэнтральнай Беларусі. Заходнепалескую мясцовую тэрміналогію (лакальныя назвы) дадзенага абраду вывучае даследчыца традыцыйных калядных абрадаў беларусаў Ю. М. Кучвальская [3, с. 59], увага якой скіравана на лінгвістычны аспект, а таксама на асаблівасці семантыкі [4].

Мэта дадзенага артыкула заключаецца ў вылучэнні спецыфікі абраднасці Вадохрышча (агульнае і лакальнае) на Заходнім Палессі праз аналіз абрадавых кодаў.

На большай частцы Заходняга Палесся Вадохрышча адзначаецца штогод 19 студзеня па праваслаўным календары. Існуе і іншая пашыраная ў хрысціянстве назва – Богаяўленне, якая сустракаецца на тэрыторыі Заходняга Палесся ў лакальнай традыцыі в. Андронава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Пярэдадзень Вадохрышча мае мясцовую назву «Водяная Коляда» [4, с. 208], а ў Маларыцкім раёне – Во(у)дяная Ко(у)ляда [3, с. 59]. На вячэрнім богаслужэнні 18 студзеня ў праваслаўных храмах адбываецца асвячэнне вады. Гаспадар са свянцонай вадой абыходзіць хату і гаспадарчыя пабудовы і акрапляе іх, што ў народнай традыцыі лічыцца аховай ад нячыстай сілы на працягу года. Потым сям’я збіраецца за святочным сталом. У гэты час трымаюць строгі пост. Спраўляюць апошнюю куццю, якую на Заходнім Палессі называюць наступным чынам: «водзяная коледа», «бедна каляда», «посная куцця», «крашчэнская куцця», «голодныца».

Вяртаючыся да асаблівасцей святочнага стала, адзначым, што абрадавыя стравы па колькасці і разнастайнасці такія ж, як і на першую куццю.

Увогуле, куцця (трэцяя) – каша з абдзёртага ячменю, ячных ці пярловых круп, прыгатаваная на вадзе з алеем ці мёдам, салодкай падлівай з цёртага маку. На Заходнім Палессі куццю маглі рабіць з зерня з першага зажыначнага снапа, які прыносілі ў хату і часткова церабілі на куццю [1, с. 101].

Святочную вячэру звычайна пачынаюць з глытка свянцонай вады і рытуальнага ўмывання, абавязкова выкарыстоўваюць святочны рушнік. Асабліва старанна абраду прытрымліваюцца дзяўчаты і хворыя, бо лічыцца, што святая вада надае прыгажосці і здароўя. Увесь год свянцоную ваду захоўваюць як надзейны сродак дапамогі пры важных сямейных падзеях [5, с. 93]. Назапашаную на Вадохрышча свянцоную ваду выкарыстоўваюць у абрадавых дзеях на працягу года ў радзільных, вясельных, пахавальных, некаторых каляндарных абрадах, а таксама ў аказіянальнай абраднасці.

У лакальных версіях абраднасць Вадохрышча разнастайная. Напрыклад, у аг. Арэхава Маларыцкага раёна на Вадохрышча мясцовыя жыхары ходзяць у царкву, а пасля службы разам са святаром рухаюцца да возера для асвячэння вады. Некаторыя веруючыя акунаюцца, а потым частуюцца куццёй і гарачай гарбатай.

Акунанне ў палонку на Вадохрышча пашырана на тэрыторыі ўсёй Беларусі і ўласціва для хрысціянскага насельніцтва айкумены.

Неабходна адзначыць, што заходнепалеская спецыфіка абраднасці Вадохрышча выяўляецца ў наступных абрадавых кодах: тэмпаральны – правядзенне абраду 19 студзеня і вечар напярэдадні, што адпавядае праваслаўнаму календару; акцыянальны – трэцяя куцця (на вадзе), агульная вячэра, назапашванне свянцонай вады для выкарыстання ў абрадах і рытуалах на працягу года (што ўласціва для народнага хрысціянства); лакатыўны – месца правядзення абрадавых падзей у хаце (куцця) і царкве, зрэдку на вадаёме; персанальны – кола ўдзельнікаў абраду складаюць жыхары вёскі; атрыбутыўны – крыж, абраз і іншая хрысціянская атрыбутыка, рушнік; музычна-вербальны і музычна-інструментальны – інструментальнае суправаджэнне абрадавых падзей часцей адсутнічае, яму ўласцівы спевы кантавай традыцыі, замовы, варожбы; пластычны – абыход гаспадаром хаты, акрапленне свянцонай вадой.

1. *Давидюк, В. Ф.* Колись була Коляда / В. Ф. Давидюк // Поліська дома : фольклор.-діалектол. зб. / упорядкув.: В. Ф. Давидюк, Г. Л. Аркушин. – Луцьк, 1991. – Вип. 1. – С. 99–106.

2. *Кухаронак, Т. І.* Лакальныя асаблівасці свята Вадохрышча ў Цэнтральнай Беларусі / Т. І. Кухаронак // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.), В. В. Калацэй, С. К. Кананові. – Мінск, 2011. – С. 89–91.

3. *Кучвальская, Ю.* Лакальныя асаблівасці заходнепалескай абрадавай тэрміналогіі каляднага цыкла / Ю. Кучвальская // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : памяці антраполага З. Мажэйкі : зб. навук. пр. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 58–59.

4. *Кучвальская, Ю. М.* Калядная абраднасць у традыцыйнай культуры Заходняга Палесся: асаблівасці семантыкі / Ю. М. Кучвальская // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2016. – Вып. 21. – С. 207–212.

5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2001–2013. – Т. 4, кн. 1 : Брэсцкае Палессе / В. І. Басько [і інш.]. – 2008. – 559 с.

**Ху Нань,** *соискатель ученой степени кандидата наук учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств».*

Научный руководитель – **В. В. Старикова,** *кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры народно-инструментальной музыки учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

# ОБРАЗ ПАВЛИНА В КИТАЙСКОЙ РЕЛИГИОЗНОЙ КУЛЬТУРЕ

В разных культурах и религиях многих стран образ павлина имеет сложное символическое значение. В Китае он формировался долгие тысячелетия. Неразрывная связь человека с павлинами отражается не только в восхвалении прекрасного